УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# НЕПАЧАЛОВІЧ ЯНКА (ІВАН ДАНІЛАВІЧ)

## ПАЭТ

## 25 МАЯ 1917 г. – 3 ЛІПЕНЯ 1969 г.

**ФОНД № 344**

**ВОПІС № 1**

**1941 – 1990**

МІНСК 2019

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 344**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
| --- | --- | --- | --- |
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ Я. НЕПАЧАЛОВІЧА | 1 - 8 | 1 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я. НЕПАЧАЛОВІЧА І ПРА ЯГО | 9 - 28 | 2 - 3 |
| 3. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 29 - 31 | 3 - 4 |
| 4. | СПІС КНІГ | | |

# Прадмова

**Янка (Іван Данілавіч) Непачаловіч** нарадзіўся 25.05.1917 г. у вёсцы Мінкавічы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1934) працаваў загадчыкам хаты-чытальні ў вёсцы Крываносава Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. У 1935 г. паступіў на літаратурны факультэт Мінскага педінстытута. З трэцяга курса накіраваны Наркаматам асветы БССР настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Дзяржынскую СШ Мінскай вобласці (1937-1940), потым – дырэктарам рускай школы №3 у Мар'інагорскай СШ Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці (1940-1941). Завочна скончыў Мінскі педінстытут у 1940 г. З кастрычніка 1941 г. і да вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў жыў у вёсцы Мінкавічы ў родных. З верасня 1942 г. да ліпеня 1944 г. быў сувязным партызанскай брыгады імя С.М. Кірава на Міншчыне. З жніўня 1944 г. да 1946 г. працаваў настаўнікам у Дзяржынску, літсупрацоўнікам у "Настаўніцкай газеце" (жнівень-лістапад 1946 г.), інспектарам школ Старадарожскага раёна Мінскай вобласці (1947-1948), настаўнікам беларускай мовы і літаратуры (1948-1959) і бібліятэкарам (1959-1968) Дараганаўскай СШ Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці. З чэрвеня 1968 г. працаваў у выдавецтве "Народная асвета" у г. Мінску.

Я. Непачаловіч трагічна загінуў 3 ліпеня 1969 г., пахаваны на радзіме ў в. Мінкавічы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці.

Член СП БССР з 1958 г. Першыя вершы Я. Непачаловіча былі надрукаваны ў 1936 г. у часопісе "Полымя рэвалюцыі". Ён аўтар зборнікаў вершаў "Мера любві" (1958), "Позні паром" (1967), "Перад захадам сонца" (1977).

Дакументы Я. Непачаловіча паступілі ў БДАМЛМ ад удавы паэта Ганны Дзянісаўны Непачаловіч у 1986 г. У 2019 г. пасля НТА быў складзены воп. №1 у колькасці 31 справы (231 дак.) за 1941-1990 гг.

Вопіс складаецца з 3-х раздзелаў.

Раздзел 1 "Рукапісы Я. Непачаловіча" ўключае: вершы, якія ўвайшлі ў яго паэтычныя зборнікі, вершы паэта ў перакладзе Ф.А. Яфімава на рускую мову (1945-1968). У канцы раздзела знаходзяцца пісьмы да Я. Непачаловіча: М.Я. Аўрамчыка, А.С. Вялюгіна, Я. Казекі, М.І. Калачынскага,

А.В. Пысіна, Я.К. Усікава, СП БССР, рэдакцый “Сельскай газеты”, “Магілёўскай праўды” і інш. (1945-1969).

Раздзел 2 утрымлівае біяграфічныя дакументы: аб удзеле Я. Непачаловіча ў партызанскім руху на Міншчыне, пасведчанні да медалёў, дыплом аб заканчэнні літфака завочнага аддзялення Мінскага дзяржаўнага педінстытута імя М. Горкага, працоўную кніжку, даведкі, пасведчанні, дагаворы з Я. Непачаловічам  на выданне яго зборнікаў паэзіі, членскія білеты, запрашэнні, характарыстыкі, юбілейныя дакументы і інш.  У канцы раздзела змешчана  невялікая група дакументаў пра Я. Непачаловіча: артыкулы пра яго, рэцэнзіі на яго зборнікі вершаў  (1941-1990).

Раздзел 3 “Выяўленчыя дакументы” прадстаўлены яго індывідуальнымі фатаграфіямі, а таксама з маці, А.С. Вялюгіным, Я.К. Усікавым [1947-1967].

Прадмову склала І.А. Евенка

вяд. архівіст

30.05.2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ Я. НЕПАЧАЛОВІЧА** | | | | |
| 1 | "Вясна і маладосць", "Гордасць народа", "Матылькі", "Паштальён", "Песня рацыяналізатара", "Светлакудры хлопчык Мішка" і інш. Вершы.<br>Аўтограф | 1945-1954 | 25 | 25 | |
| 2 | "Аснова шчасця", "Браты", "Даведкі", "Зрываючы лісток календара", "Моцныя рукі", "Першыя крокі", "Таварышу" і інш. Вершы.<br>Аўтограф | 1955-1957 | 30 | 30 | |
| 3 | "Аганёк", "Дасціпная", "Месяц", "Мінскім сябрам", "Партыі", "Развіхрылася віхура", "Рубель", "У дарозе", "Явачная кватэра" і інш. Вершы.<br>Аўтограф | 1958-1968 | 26 | 26 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | "Ад зары і да зары", "Апора", "Зварот на Радзіму", "Млын", "Народнае бяссмерце", "Пра рэабілітацыю", "Пчаляры", "П'яніцы" і інш. Вершы.<br>Аўтограф | 1952-1967 | 46 | 46 | |
| | * * * | | | | |
| 5 | "Гады", "Маё крэда", "Пахнуць нашыя кватэры", "У жыцці не бывае драбніц" і інш. Вершы.<br>Выразкі з часопісаў і газет | 1954-1965 | 6 | 10 | |
| 6 | Я. Непачаловіч. "Воскресенье", "Корни", "Поздний паром". У перакладзе Ф.А. Яфімава на рускую мову.<br>Выразка з часопіса | 1968 | 1 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 7 | Пісьмы М.Я. Аўрамчыка (2), А.С. Вялюгіна (3), І. Д. Казекі, М.І. Калачынскага, А.В. Пысіна, Р.В. Родчанкі, Я.К. Усікава (4) да Я. Непачаловіча | 1967-1969 | 14 | 13 | |
| 8 | Пісьмы СП БССР, рэдакцый газет "Сельская газета", "Магілёўская праўда" і інш. Я. Непачаловічу аб супрацоўніцтве | 1964-1965 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я. НЕПАЧАЛОВІЧА І ПРА ЯГО** | | | | |
| 9 | Дыплом І.Д. Непачаловіча аб заканчэнні літаратурнага факультэта завочнага аддзялення Мінскага дзяржаўнага педінстытута імя М. Горкага | 1941 | 2 | 1 | |
| 10 | Даведкі Беларускага штаба партызанскага руху, Старадарожскага раённага камітэта КПБ і інш. на імя І.Д. Непачаловіча - сувязнога партызанскай брыгады імя С.М. Кірава | 1945-1946 | 3 | 3 | |
| 11 | Працоўная кніжка І.Д. Непачаловіча | 1946 | 6 | 1 | |
| 12 | Пасведчанні да медалёў "За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.", "Двадцать лет победы в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг." на імя І.Д. Непачаловіча | 1946,1965 | 4 | 2 | |
| 13 | Пасведчанне супрацоўніка "Настаўніцкай газеты" на імя І.Д. Непачаловіча | 1947 | 1 | 1 | |
| 14 | Пасведчанне аб вызваленні ад воінскага абавязку на імя І.Д. Непачаловіча | 1959 | 6 | 1 | |
| 15 | Дагаворы Дзяржвыдавецтва БССР, выдавецтва "Беларусь" аб выданні зборнікаў вершаў Я. Непачаловіча "Мера любві", "Позні паром" | 1957,1966 | 4 | 2 | |
| 16 | Даведкі СП БССР, Дзяржынскай СШ №1 Мінскай вобласці, выдавецтва "Народная асвета" і інш. аб працы І.Д. Непачаловіча | 1958-1968 | 6 | 6 | |
| 17 | Членскія білеты Саюза пісьменнікаў СССР, Літаратурнага фонда СССР на імя І.Д. Непачаловіча | 1958,1960 | 12 | 2 | |
| 18 | Запрашэнні Праўлення СП БССР, Міністэрства асветы БССР, ЦК ЛКСМБ і інш. Я. Непачаловічу на з'езды СП БССР, вечары, канферэнцыі.<br>Да запрашэнняў на з'езды СП БССР прыкладзены мандаты дэлегата з'ездаў на імя Я. Непачаловіча | 1959-1967 | 16 | 12 | |
| 19 | Аўтабіяграфія Я. Непачаловіча.<br>Аўтограф | 1964 | 1 | 1 | |
| 20 | Характарыстыкі дырэктара Дараганаўскай СШ Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці на І.Д. Непачаловіча - настаўніка і бібліятэкара школы | 1968 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 21 | Ганаровыя граматы Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Асіповіцкага раённага аддзела народнай асветы і інш. І.Д. Непачаловічу ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння | 1967 | 3 | 3 | |
| 22 | Віншавальныя адрасы СП БССР, Асіповіцкага райкама КП Беларусі ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Я. Непачаловіча .<br>З аўтографамі пісьменнікаў | 1967 | 4 | 2 | |
| 23 | Віншавальныя тэлеграмы А. Астрэйкі, А.С. Вялюгіна, П.Н. Кавалёва, супрацоўнікаў часопіса "Вожык" і інш. у сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Я. Непачаловіча | 1967 | 8 | 8 | |
| 24 | Артыкулы Р.В. Няхая, П.Ф. Прыходзькі, Я.К. Усікава да 50-годдзя з дня нараджэння Я. Непачаловіча.<br>Выразкі з газет | 1967 | 3 | 3 | |
| 25 | Некралог Я. Непачаловіча.<br>Выразка з газеты | 1969 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 26 | Артыкулы І. Аношкіна, А. Мікалаева, М.П. Парахневіча і інш. да 60-годдзя з дня нараджэння Я. Непачаловіча.<br>Выразкі з газет | 1977 | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 27 | Артыкулы А. Базарэвіча, А. Вятрынскага, М.П. Парахневіча пра Я. Непачаловіча.<br>Выразкі з газет | 1967-1990 | 4 | 4 | |
| 28 | Рэцэнзіі А. Альшанскага, А.С. Вялюгіна, М.І. Калачынскага, І.Ф. Кудраўцава, М.П. Парахневіча і інш. на зборнікі вершаў Я. Непачаловіча "Мера любві", "Позні паром".<br>Аўтографы А.С. Вялюгіна, М.І. Калачынскага, выразкі з газет | 1958-1967 | 9 | 6 | |
| | **3. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 29 | Фатаграфіі Я. Непачаловіча, індывідуальныя | [1947-1967] | 3 | 3 | |
| 30 | Фатаграфіі: Я. Непачаловіча з П.Е. Непачаловіч (маці), Д.І. Непачаловіча (бацькі), індывідуальная | 1960 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 31 | Фатаграфіі Я. Непачаловіча з А.С. Вялюгіным, Я.К. Усікавым | 1960 | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 31 (трыццаць адзін)

спраў з № 1 па № 31 , 231 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.